# Прамова сакратара ЦК ЛКСМБ тав. К. Т. Мазурава

Таварышы дэпутаты! Гітлераўскія бандыты імкнуцца знішчыць наш народ.

Нямецкаму звяр'ю асабліва ненавісна наша моладзь. Ва ўсіх кіруючых дакументах акупацыйных улад і выступленнях гітлераўскіх главароў праводзіцца на-



стойлівае патрабаванне — фізічна вынішчаць савецкую моладзь, бо яна смяротэльна ненавідзіць немцаў. Гітлераўцы арганізавалі сістэматычныя аблавы на моладзь, праводзяць масавыя расстрэлы ў гарадах і сёлах, гоняць яе на катаргу ў Германію.

Але нямецкія захопнікі не ў сілах зламаць волю беларускай моладзі да барацьбы. Большавіцкая партыя выхавала ў моладзі бязмежную адданасць Радзіме, палкую любоў да свайго народа і бязлітасную нянавісць да ворага.

Камсамол Беларусі, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і асабіста таварыша Панамарэнка, праводзіць вялікую работу па ўцягненню моладзі ў партызанскую вайну супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Моладзь складае больш паловы асабовага саставу партызанскіх атрадаў.

Два гады таму назад прагучалі першыя імёны маладых беларускіх партызан Ані Шубянок, Марка Фелітарава, Валі Герасімавай, якія вызначыліся ў баях супроць нямецкіх захопнікаў. Колькі новых слаўных імён камсамольцаў ведае зараз Беларусь!

Героі Савецкага Саюза: Міхаіл Сільніцкі—адважны партызан-кулямётчык, Аляксандр Ісачанка—сакратар Гомельскага гаркома камсамола, выдатны арганізатар моладзі і падрыўнік, Фёдар Котчанка, які пусціў пад адхос 16 нямецкіх эшалонаў, Віктар Лівенцаў, Аляксандр Азончык, Мікалай Зябніцкі, Уладзімір Ціхаміраў. Гэтых праслаўленых Герояў Савецкага Саюза—маладых партызан—даў Радзіме камсамол Беларусі.

Беларуская моладзь прайшла суровую школу вайны, узмужнела і загартавалася ў баях з ворагам. Камсамольцы—гэта перадавыя байцы партызанскіх атрадаў, гэта кулямётчыкі, мінамётчыкі, разведчыкі, дыверсанты, знішчальнікі-паляўнічыя; кожны з іх вядзе асабісты рахунак помсты ворагу. І гэтыя рахункі помсты з кожным днём растуць.

За два месяцы камсамольска-маладзежныя дыверсійныя групы Пінскай вобласці пусцілі пад адхос 41 нямецкі эшалон, узарвалі 1.185 рэек, 83 масты, забілі 2.882 нямецкіх салдат і афіцэраў. Маладыя партызаны Баранавіцкай вобласці ўзарвалі 109 эшалонаў. У дзень 26-й гадавіны Чырвонай Арміі камсамольска-маладзёжныя групы падрыўнікоў Брэсцкай вобласці ўзарвалі 14 эшалонаў.

Мінскія партызаны з вялікім захапленнем гавораць аб выключнай смеласці і вытрымцы падрыўніка Мікалая Анохіна, які на трое сутак ляжаў у балоце, чакаючы зручнага моманту, каб падарваць варожы эшалон. Мікалай пусціў пад адхос 11 нямецкіх эшалонаў. У чарговай аперацыі ён быў смяротэльна паранены. Яго апошнія словы былі: «Жыцця не шкадую, толькі шкадую, што больш не змагу біць гітлераўскіх бандытаў».

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі